**Сукала надвое адказаў пра сьмяротнае пакараньне**

**Лукашэнка павіншаваў дыктатара Паўночнай Карэі**

**Кандыдаты ад БНФ ня хочуць заўчасна сыходзіць з дыстанцыі**

**Беларус ізноў мацнейшы**

**Імпартэры адбілі першую атаку**

**Дзень беларускага пісьменства не для ўсіх**

На саміце АДКБ, што адбыўся 4–5 верасьня ў Маскве, краіны-ўдзельніцы арганізацыі асьцярожна падтрымалі дзеяньні Расеі на Каўказе і не прынялі рашэньня адносна прызнаньня незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Расея пагадзілася з гэтым асьцярожным меркаваньнем краінаў АДКБ, але не губляе надзеі дамагчыся прызнаньня вынікаў сваёй вайсковай апэрацыі на Каўказе хаця б ад некаторых краінаў былога СССР, перш за ўсё ад Беларусі.

Ініцыятарам разгляду пытаньня пра статус Паўднёвай Асэтыі і Абхазіі на саміце АДКБ стаў Аляксандар Лукашэнка. Для беларускага прэзыдэнта гэта была ўдалая спроба перавесьці стрэлкі і адбіць псыхалягічную атаку Крамля, які патрабаваў ад Менску неадкладнага прызнаньня Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі.

У пытаньні ўхваленьня сваіх дзеяньняў на Каўказе і замацаваньня іх вынікаў у выглядзе прызнаньня незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі Расея сутыкнулася ня толькі з рэзкім процідзеяньнем ЗША і Эўропы, але і з




photo.bymedia.net

пагрозай хуткага распаду постсавецкіх міждзяржаўных інстытуцыяў. Стрыманая пазыцыя партнэраў Расеі па АДКБ, СНД, Саюзнай дзяржаве ды іншых постсавецкіх міждзяржаўных утварэньнях вымусіла Расею зьнізіць напор у дачыненьні да замацаваньня вынікаў пяцідзённай вайны ў Грузіі з тым, каб захаваць хаця б ілюзію кіраванасьці гэтых інстытутаў і лідэрскага становішча Расеі ў іх.

У гэтых умовах Крэмль, падобна, гатовы дамагацца прызнаньня Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі там, дзе гэта магчыма. Такой магчымасьцю, хутчэй за ўсё, цяпер бачыцца Саюз Беларусі і Расеі. Сьпікер Дзярждумы Расеі Барыс Грызлоў, які таксама зьяўляецца старшынём парлямэнцкага сходу Саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі, паведаміў, што пытаньне наконт прызнаньня незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі будзе абмяркоўвацца на бліжэйшай сэсіі саюзнага парлямэнту.

Паводле некаторых дадзеных, Крэмль ставіў Менску ультыматум: прызнаць Абхазію і Паўднёвую Асэтыю да 9 верасьня. У адваротным выпадку цана газу будзе перавышаць для Беларусі ў 2009 г. 200 даляраў за тысячу кубамэтраў. І Лукашэнка фактычна паабяцаў зрабіць гэта новым складам парлямэнту пасьля выбараў 28 верасьня. У якасьці прыкладу ён нагадаў, як гэтае прызнаньне адбылося ў расейскім парлямэнце. (Дзярждума прагаласавала адзінагалосна «за».)

Сёньня відавочна, што Масква не гатовая прапанаваць Менску вяртаньне да папярэдніх парамэтраў

саюзнага кантракту, а толькі кароткачасовыя тактычныя выгоды. Магчыма, гэты кошт, то бок вяртаньне да папярэдняга фармату адносінаў, якія існавалі да 2007 г., здаўся бы беларускаму кіраўніцтву дастатковым. Захаваньне жа яшчэ на год нізкіх коштаў газу (і,

мусіць, крэдыт у 2 млрд. даляраў) не адмяняе зацікаўленасьці Лукашэнкі ў зьніжэньні напружанасьці ў адносінах з Захадам. Разам з тым, чыноўнікі ўраду паведамілі, што вярстаюць бюджэт на наступны год, зыходзячы з цаны газу 140 даляраў за тысячу кубамэтраў.

На думку шэрагу экспэртаў, вялікі ўплыў на сацыяльна-эканамічную і палітычную сытуацыю ўнутры краіны можа зрабіць абмежаваньне гандлёвай надбаўкі на імпарт.

Пастановай Міністэрства эканомікі №179 гандлёвая надбаўка пры фармаваньні коштаў імпартных тавараў абмяжоўваецца 30% у суме для ўсіх удзельнікаў працэсу рэалізацыі імпарту – гуртавых пастаўшчыкоў, пасярэднікаў, арганізацыяў гандлю. Бізнэс-колы Беларусі ацанілі гэтую пастанову рэзка негатыўна, заявіўшы, што такая мера можа прывесьці ня толькі да рэзкага падзеньня імпарту ў краіну і банкруцтва як прадпрыемстваў-імпартэраў, так і арганізацыяў гандлю, але і значных згубаў бюджэту. Зьявіліся чуткі, што ўрад можа адкласьці ўвядзеньне ў дзеяньне пастановы ці наагул адмяніць яе.

Пастановай прадугледжана, што імпартэры пацьвярджаюць абгрунтаванасьць кантрактных цэнаў на тавары замежнага паходжаньня зьвесткамі пра ўзровень цэнаў вытворцаў указаных тавараў, біржавых цэнаў і/ці цэнаў аптовых рынкаў у краінах-пастаўшчыках гэтых тавараў.

Старэйшы партнэр «Юрыдычнай групы «АргументЪ» Дзяніс Алейнікаў, камэнтуючы магчымыя наступствы пастановы №179, паведаміў, што беларускія імпартэры могуць вярнуцца да схемаў вядзеньня бізнэсу, якія выкарыстоўваліся ў 1990-х, калі замежныя тавары пастаўляліся ў краіну праз кампаніі, зарэгістраваныя ў афшорах.

На думку Д. Алейнікава, афшарызацыя імпарту для многіх пастаўшчыкоў можа стаць адзінай магчымасьцю выжыць. Уведзенае Мінэканомікі абавязальніцтва – пацьвярждаць абгрунтаванасьць кантрактных цэнаў на замежныя тавары – ударыць нават па самых празрыстых імпартэрах.

Пасьля пазачарговага паседжаньня Каардынацыйна-кансультацыйнай рады бізнэс-колаў віцэ-старшыня Менскага сталічнага саюзу прадпрымальнікаў і працадаўцаў Віктар Маргелаў паведаміў, што набыцьцё моцы пастановай №179 можа быць адкладзенае.

«Мы дамовіліся стварыць працоўную групу для глыбокага вывучэньня коштавага рэгуляваньня дзейнасьці імпартэраў. Дзевяноста адсоткаў, што пастанова не набудзе моц (пастанова апублікаваная 3 верасьня, павінна набыць моц праз 10 дзён – рэд.). Мы прыйшлі да згоды, што яна не патрэбная ні ўладзе, ні бізнэсу. Наколькі адтэрмінуем – не зразумела. Я думаю, мы пасьпеем адмяніць яе да набыцьця моцы», – сказаў В. Маргелаў.

Ён выклаў дадатныя і адмоўныя наступствы гэтага рашэньня Мінэканомікі.

«Дадатныя наступствы: на некаторы час (1–2 месяцы) зьнізяцца цэны многіх імпартных тавараў, крыху зьнізіцца афіцыйная сума спажывецкага імпарту, за кошт зьніжэньня цэнаў на імпартныя тавары на 1–2 месяцы запаволіцца паказьнік тэмпаў інфляцыі», – сказаў В. Маргелаў.

Разам з тым ён зьвярнуў увагу, што прагноз па адмоўных наступствах гэтага рашэньня нашмат большы.

«У кароткатэрміновай пэрспэктыве магчымае павышэньне долі замежных тавараў за кошт



photo.bymedia.net

павышэньня цаны на ніх. У сярэдне- і доўгатэрміновай пэрспэктыве асартымэнт афіцыйна ўвезеных імпартных тавараў у крамах значна скароціцца – гэта будзе стымуляваць замежныя шоп-туры і разьвіцьцё чорнага рынку. За кошт гэтага абарот гандлёвых арганізацыяў паменшыцца на 15% – настолькі ж павялічыцца вываз валюты з краіны», – паведаміў В. Маргелаў. Ён дадаў, што рэнтабэльнасьць гандлёвых прадпрыемстваў можа апусьціцца да адмоўнай велічыні, што можа выклікаць закрыцьцё невялікіх крамаў і скарачэньне 25 тыс. чалавек.

У некаторых сэктарах рынку магчымы крах беларускіх вытворцаў, напрыклад, у гандлі залатымі вырабамі, бо цэны на айчынную прадукцыю апынуцца на 30% вышэй, чым на расейскую. Зьніжэньне гандлёвага абароту выкліча скарачэньне рэклямных даходаў СМІ. Да 80% дробных і сярэдніх прадпрыемстваў-імпартэраў будуць вымушаныя згортваць сваю дзейнасьць. У краіне могуць узьнікнуць перабоі з таварамі крытычнага імпарту, пры цане на каву ў Калюмбіі 2 даляры за 1 кг яе ніхто не паставіць на беларускі рынак з трыццаціадсоткавай нацэнкай. Ужо заявілі пра адмову ад крытычнага імпарту пастаўшчыкі дзіцячай вопраткі, падсаладжальнікаў. Буйныя імпартэры для выжываньня будуць вымушаныя рэзка скараціць збытавую сетку, вызваліць склады, доступ да імпартнай прадукцыі пагоршыцца ў малых гарадах, там жа павялічыцца беспрацоўе.

Замміністра эканомікі Ўладзімер Адашкевіч адзначыў, што прычынай прыняцьця пастановы стаў намер зрабіць роўныя ўмовы рэалізацыі айчынных і імпартных тавараў.

Пры гэтым іншыя ўдзельнікі рады адзначылі, што бачаць рэальную пагрозу пастаўкам камплектуючых на беларускія прадпрыемствы і выкананьню кантрактаў зь імі. Удзельнікі рады не пагадзіліся з шэрагам доказаў прадстаўніка Мінэканомікі ў частцы стымуляваньня вытворчасьці айчынных тавараў. «Нельга арганізаваць вытворчасьць усяго ў Беларусі, нават СССР ня мог усё вырабляць», – сказаў адзін з удзельнікаў рады.

Між тым на хвалі барацьбы зь імпартам мясцовыя ўлады ў Менску ўжо прынялі рашэньне давесьці кампаніям-імпартэрам заданьні па экспарце тавараў ня менш за 25% ад аб’ёму імпартных паставак тавараў, якія яны ажыцьцяўляюць.

АФІЦЫЙНА

## Сукала надвое адказаў пра сьмяротнае пакараньне

***Старшыня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала мяркуе, што Беларусь шчыльна падышла да ўводу мараторыю на сьмяротнае пакараньне.***

Сёлета быў толькі адзін выпадак сьмяротнага прысуду, тры чалавекі былі асуджаныя да пажыцьцёвага зьняволеньня. Разам з тым, на думку старшыні, нельга ігнараваць волі народу, які на рэфэрэндуме падтрымаў інстытут сьмяротнага пакараньня.

ПАЛІТЫКА

## Лукашэнка павіншаваў дыктатара Паўночнай Карэі

***У віншаваньні з нагоды паўстаньня КНДР Лукашэнка выказаў спадзяваньне на канструктыўнае супрацоўніцтва з краінай Кім Чэн Іра.***

Аляксандар Лукашэнка павіншаваў старшыню Дзяржаўнага камітэту абароны Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Кім Чэн Іра з нагоды Дня заснаваньня КНДР, паведамляе прэс-служба кіраўніка краіны.

“А. Лукашэнка выказаў спадзяваньне на разьвіцьцё канструктыўнай супрацы Беларусі й КНДР на карысьць народаў абедзьвюх краінаў”, – гаворыцца ў заяве прэзыдэнцкай прэс-службы.

Кім Чэн Ір – адзін з найбольш крывавых дыктатараў сьвету. За 14 гадоў ягонага кіраваньня ад голаду й гвалту з боку ўладаў у Паўночнай Карэі загінулі дзясяткі тысячаў чалавек. У краіне адбываюцца публічныя сьмяротныя пакараньні, прымушэньні да абортаў, дзейнічаюць канцэнтрацыйныя лягеры.

АПАЗЫЦЫЯ

## Кандыдаты ад БНФ ня хочуць заўчасна сыходзіць з дыстанцыі

***Намесьнік старшыні Партыі БНФ Юрась Губарэвіч агучыў на паседжаньні Ўправы БНФ зварот 15 кандыдатаў у дэпутаты ад гэтай партыі з просьбай перагледзець рашэньне Сойму, згодна зь якім усе франтаўскія***

***кандыдаты маюць зьняцца з выбарчай гонкі 23 верасьня.***

Паводле Юрася Губарэвіча, з такой заявай выступіла 15 кандыдатаў ад БНФ, пераважна з рэгіёнаў, якія паміж сабою абмеркавалі рашэньне Сойму аб зьняцьці кандыдатур 23 верасьня і прыйшлі да высновы, што іх ўдзел у выбарах трэба працягваць да завяршэньня кампаніі. Кандыдаты аргумэнтуюць свой зварот да Сойму тым, што ягонае рашэньне не было падтрыманае іншымі суб'ектамі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў, якія фактычна праводзілі супольнае вылучэньне кандыдатаў, і што толькі ўдзел у выбарах дасьць магчымасьць засьведчыць фальсыфікацыі ўладаў.

ГРАМАДЗТВА

## Беларус ізноў мацнейшы

***Кікбаксэр Зьміцер Шакута стаў 12-разовым чэмпіёнам сьвету ў папулярнай вэрсіі тайляндзкага боксу.***

Менскі кікбаксэр Зьміцер Шакута пацьвердзіў званьне мацнейшага ў сьвеце. Чарговы раз ён абараніў свой тытул у Галяндыі. Там




ён перамог па пунктах мясцовага спартоўца Сэма Брана. Такім чынам ён стаў 12-разовым чэмпіёнам сьвету ў папулярнай вэрсіі тайляндзкага боксу К-1 у вагавай катэгорыі да 75 кг.

У лістападзе мянчук возьме ўдзел у Турніры чатырох у Стамбуле. Супернікамі Зьмітра Шакуты будуць кікбаксэры з Тайлянду, Турцыі й Новай Зэляндыі.

ЭКАНОМІКА

## Імпартэры адбілі першую атаку

***На імя кіраўніка ўраду Сяргея Сідорскага быў накіраваны ліст з прапановай прыпыніць увядзеньне ў дзеяньне пастановы № 179, які акрамя кіраўнікоў асноўных прадпрымальніцкіх аб'яднаньняў падпісаў дырэктар дэпартамэнту па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Аляксандар Ліхачэўскі. За перагляд пастановы выказаліся Міністэрства гандлю і Белкаапсаюз. Мінгандлю палічыла неабходным захаваць абмежаваньне гандлёвых надбавак толькі ў дачыненьні да сацыяльна значных харчовых тавараў.***

Вынікам актыўнасьці прадпрымальнікаў стала стварэньне Міністэрствам гандлю працоўнай групы, якая з улікам прапановаў, выказаных прадпрымальнікамі, мусіць падрыхтаваць удакладненьні да пастановы. Імпартэры пакуль працуюць па ранейшых правілах.

КУЛЬТУРА

## Дзень беларускага пісьменства не для ўсіх

***У Барысаве 7 верасьня прайшоў Дзень беларускага***




***пісьменства. Сёлета фэстываль ладзіўся пятнаццаты раз і з падвышанымі мерамі бясьпекі.***

Арганізатары прысьвяцілі юбілейны фэстываль беларускага кнігавыданьня гісторыі сьвята. На вуліцах старажытнага Барысава было шмат гербаў гарадоў, у якіх Дзень беларускага пісьменства праводзіўся раней. У гарадзкім парку быў урачыста адкрыты памятны знак "Залаты фаліянт", прысьвечаны штогадоваму сьвяту.

Сьцены дамоў у цэнтры Барысава ўпрыгожылі партрэтамі беларускіх асьветнікаў. На кніжных выставах сталі выданьні сябраў афіцыйнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, былі асобныя стэнды дзяржаўных выдавецтваў.




У віншаваньні з нагоды фэстывалю кіраўнік Беларусі Аляксандар Лукашэнка выказаў упэўненасьць, што “Дзень беларускага пісьменства стане важнай падзеяй у культурным жыцьці Беларусі, паспрыяе далейшай кансалідацыі насельніцтва рэспублікі на трывалым падмурку высокіх духоўных каштоўнасьцяў, закладзеных славутымі продкамі”.

У адрозьненьне ад мінулых гадоў, на сёлетнім фэстывалі ўпершыню месца правядзеньня асноўных сьвяточных мерапрыемстваў было агароджанае турнікетамі. Каб патрапіць на галоўную пляцоўку на Цэнтральнай плошчы, неабходна было паказаць асабістыя рэчы супрацоўнікам міліцыі. Людзей з заплечнікамі, а таксама з алькагольнымі напоямі, бутэлькамі мінэральнай вады ці соку не прапускалі. Не змаглі патрапіць у цэнтар і гледачы на роварах. Цягам усяго дня ў Барысаве не гандлявалі алькаголем.

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap.
The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.